# ЗЯРНЯТКА 23

11 лютага 2018 г. VI Звычайная нядзеля, Год В

*Праказа сышла з яго, і ён стаў чысты* *Мк 1, 40-45*

Прыйшоў да Езуса пракажоны і, упаўшы на калені, прасіў Яго: Калі хочаш, можаш мяне ачысціць. Езус, злітаваўшыся над ім, працягнуў руку, дакрануўся да яго і сказаў яму: Хачу, будзь ачышчаны. І адразу ж праказа сышла з яго, і ён стаў чысты.

Езус строга перасцярог яго і адразу адправіў, кажучы: Глядзі, нікому нічога не кажы; але ідзі, пакажыся святару і дай ахвяру за ачышчэнне сваё, як загадаў Майсей, для сведчання ім.

Але ён, выйшаўшы, пачаў абвяшчаць і шмат расказваць пра падзею, так што Езус не мог ужо адкрыта ўвайсці ў горад, але быў здалёк, у пустэльных мясцінах. І прыходзілі да Яго адусюль.



*Гэта слова Пана.*

**Ты атуляеш мяне радасцю збаўлення.**

# Знайдзі 14 адрозненняў





Малітва.

Дзякую Табе, Пане Езу, што ачышчаеш маю душу ад усялякай праказы зла і граху. Дзякую Табе, што ніколі не пакінеш мяне і заўсёды працягнеш мне руку Сваю. Учыні так, я ўмеў цаніць Твае дары і ласку. Амэн.